Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

Кошт нумару—15 руб. (Вып. 22 г.

Падпісная плата—
Звычайная—350 р. льготная—250 р.
Плата за абвесткі—300 руб. за радок петыту.
Сьпецыяльныя—на 50% даражэй.
Плата за публікацыю аб страце дакументаў:
За 1 дакумент—500 руб.
„ кожны дадатковы—200 руб.
„ копію квітанцыі—100 руб.
Чырвон. і утрымальцам Сал. Забясьпекі—даромна.
Падпіска і абвесткі прымаюцца у Контрагэнцтве пры Дзяржаўным Выдавецтве.
(Менск, Петрапаўлаўская, 8).

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
МЕНСК, Замкавая, 97.

ВЫДАНЬНЕ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ.

ТРЭЦІ ГОД ВЫДАНЬНЯ. Штодзенная газэта. № 253 (658). Серада, 15-га лістапада 1922 г.

Крызіс беларускага руху.

Перад намі першы нумар новай беларускай газэты «Вясковы пралетары». Выдаецца ў Горадні. Мае лёзунг «Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!» Заклікае галасаваць за сьпісак № 5, за сьпісак камуністычнага саюзу пралетарыяту гораду і вёскі. Газэта напісана простаю, жывою беларускаю моваю. Відаць, што над газэтаю працуе беспартыйны беларускі рабочы і селянін, які хоць і ня стаў яшчэ камуністам але падыйшоў да яго блізка, падыйшоў шчыра і падаў яму сваю братэрскую руку. Невядома, ці будзе газэта выходзіць рэгулярна. Мамчыма, што палацыя і вока дафэнзывы ўжо зьвярнулі на яе ўвагу і магчыма, што газэта будзе зачынена...

Але нас цікавіць зараз ня тое, будзе ці ня будзе зачынена газэта. Нас цікавіць зараз тое, што газэта выйшла, што газэта зьявілася ў сьвет. Нас цікавіць зараз тое, што сярод беларускіх культурных работнікаў, якія дагэтуль былі абвароджаны ідэямі нацыянальнага здраджэньня, — знайшліся такія, што расчаравалісь у нацыяналізьме і шавінізьме і ступілі на новы шлях, на шлях клясавай сьвядомасьці і барацьбы супольна з польскімі рэвалюцыйнымі рабочымі і бядвейшым польскім селянствам. У нашы часы, калі ня толькі ў Польшчы, а падчас і ў нас пад бокам яд нацыяналізму і шавінізму засьцілае вочы беларускім культурным работнікам і мімаволі вядзе іх к апазыцыі рабочай клясе,—у нашы часы факт паяўленьня на сьвет першай рабочай беларускай газэты ў Польшчы, беспартыйнай, не камуністычнай, але выступаючай у згодзе з камуністамі, разам з імі—мае вялікае значэньне.

Факт гэты сьведчыць аб тым, што нацыянальны беларускі рух у Польшчы пачынае раскладацца на часткі, прычым кожная з гэтых частак пачынае кіравацца на сваю клясу. Пачынаецца раскол беларускага руху.

Лушкевіч, Тарашкевіч і іншыя «дзеячы» з блёку № 16—зьвязываюць свой лёс з жыдоўскім купцом у Варшаве і нямецкім юнкерам, з якімі ў згодзе выступаюць на выбарах у Сойм. Другая частка беларусаў, шабачыўшы, куды вядзе іх, так званы, блёк нацыянальных меншасьцяў, пабачыўшы буржуазны сэнс гэтае арганізацыі,—кінулася ўлева і пачала шукаць новага шляху, пачала падыходзіць бліжэй к рэвалюцыйнаму рабочаму руху. Гэта група, мусіць, і выпусьціла першую рабочую беларускую газэту заграніцай—«Вясковы пралетары».

Нацыяналістычны туман, які абхапіў быў беларускую інтэлігэнцыю, патроху пачынае расходзіцца пад ударамі грому клясавай барацьбы.

Вось як, напрыклад, «Вясковы пралетары» ў артыкуле «Адзіны ратунак» тлумачыць сваё палажэньне:

«Самыя прыгожыя нацыяналістычныя лёзунгі ў ваччу абдураных работнікаў і селян патускнелі і проста абрыдлі...

Зрабілася, нарэшце, ясна, што ніводная краёвая партыя, не адкінуўшая пазаклясавых перажыткаў, не паможа агульнай бядзе.»

Аб беларускіх нацыяналістах газэта піша: «Ад іх, нездольных да шырокай арганізацыйнай працы ў масах,—зьнявераныя селянства ад вярнулася як ад бясплодных смаўжыц у сацыяльным пытаньні.»

Якім жа шляхам ісьці? Дзе шукаць ратунку? „Калі прыдзе патрэбная сьвядомасьць—беларусы бязумоўна высунуць з сябе найбольш актыўных працаўнікоў з радоў беларускага пралетарыяту.

Каму ж, як не беларусам шукаць роўнай і лепшай долі пралетарскім шляхам".

Так адказвае «Вясковы пралетары» на пытаньне—з кім ісьці і проці каго ісьці. Раскол, які ажыўіць беларускі рух, які дасьць пралетарскае сэрца ў адну частку гэтага руху, які разьвее туман нацыяналізму і шавінізму—такі раскол для рабочага руху карысны.

Крызіс беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Белару і тлумачыцца выключна абвастраньнем клясавай барацьбы ў Польшчы і нездаволеньнем бяднейшага селянства. Ён мае вялікае значэньне для беларускага руху наогул. Для нас, для будаўнікоў Савецкай Беларусі, становіцца ясна—хто наш вораг і хто наш друг. Тыя, хто разам з рабочым рухам, разам з рэвалюцыяй, тыя, хоць і не камуністы—тыя будуць працаваць з намі. Тыя ж, хто з буржуазнымі групамі, ад тых падалей і тых падалей ад нас. Няхай раскол і крызіс беларускага руху ў Заходняй Беларусі будзе для нас уроакам. Хай навучыць нас, як вылечыцца ад нацыяналістычнай атруты.

М. МАРАЗОЎСКІ.

Ахвяры Камуністычнай Рабочай Партыі Польшчы.

З усіх партыяў і груп сучаснай Польшчы, якія спрачаліся перад выборамі ў Польскі Сойм—толькі адна група моцна стояла на клясавым, пралетарскім грунце.

Гэта „Саюз пралетарыяту гораду і вёскі", гэта сьпісак № 5.

Ні на адзін крок не адышоў ён ад той праграмы, якую абвясьціў тры месяцы таму назад пры сваім заснаваньні.

Але справа і сэнс выбараў ня ў ліку кандыдатаў. Сярэдняцкі трыбуны можа і адзін дэпутат-камуніст з такім жа посьпехам, як і вялікая фракцыя, тым больш, што „Саюз пралетарыяту гораду і вёскі"—голасна абвясьціў яшчэ з пачатку выбарнай кампаніі, што на Сойм ён бачыць выключна ў ратунак для рабочых і селянскай беднаты ён бачыць выключна ў рэвалюцыйным руху і ў зьмене ўлады буржуазнай на ўладу працоўных, аб чым і будуць гаварыць дэпутаты Саюзу з соймавай катэдры.

Калі толькі з гэтага боку ацэньваць вынікі выбарнай кампаніі Саюзу,—то і то прыходзіцца прызнаць іх здавальняючымі.

Камуністы, якія прыймалі ўдзел у арганізацыі Саюзу,— арганізацыі чыста беспартыйнай,—дабіліся 2 3-х месц у Сойме, што і трэба было.

Але ж прымем пад увагу вялікія ахвяры, якія понёс Саюз. Прымем пад увагу, што каля тысячы, а можа і больш членаў Саюзу сядзяць зараз па турмах і чакаюць суда, або, можа, і высылк.

Сярод арыштованых шмат камуністаў.

І паўстае пытаньне. А можа ня варта было пачынаць перадвыбарнай барацьбы? А можа з-за 2—3 мандатаў у Сойм на варта было ствараць Саюзу пралетарыяту гораду і вёскі"? Можа лепш было б абкатаваць выбары і, злажыўшы рукі, сядзець і чакаць у моды пагоды?

На ўсе гэтыя запытаньні можна адказаць словамі К. Маркса, які сказаў, што адзін крок барацьбы рабочых даражэй, чымсь сотня праграм.

Справа ня ў тым, што прайшлі ці не прайшлі кандыдаты ў Сойм. Справа ў тым што, дзякуючы першай выбарнай кампаніі і актыўнаму ўдзелу камуністаў у гэтай кампаніі, пробіта непрыступная сьцяна буржуазнай і шавіністычнай прэсы.

Дзякуючы лёзунгу „Саюзу пралетарыяту гораду і вёскі"—у ерапейскіх грамадзянскіх сучасных Польшчы можна ведаць, у чым можна знайсьці ратунак. Не ў нацыяналістычнай абасобленасьці і шавінізме, як гэта робяць „ППС", „Бунд і іншыя нібы то сацыялістычныя рабочыя партыі, а ў еднасьці пралетарскай,—бязрозьніцы племені і нацыянальнасьці—паратунак.

Так проста выстаўлены на паперы гэты лёзунг мусіць зразумець толькі нямногія больш-менш сьвядомыя рабочыя...

Каб таксама зразумець гэты лёзунг масам—патрэбна барацьба за гэту еднасьць, патрэбны ахвяры, якія дадуць гэтаму лёзунгу папулярнасьць і арэол.

Патрэбна асвяміць гэты лёзунг рабочаю крывёю і ахвярамі, гэтым сьветам клясавай барацьбы, і тагды ён, гэты лёзунг пралетарскай еднасьці, глыбока западзе ў сэрцы рабочага, пакіне ў яго душы незгладзімы сьлед.

Калі з гэтага боку разглядаць вынікі выбарнай кампаніі „Саюзу рабочых гораду і вёскі",—то трэба прызнаць, што вынікі вкупілі ахвяры з ліхваю. Тыя дзесяткі і сотні тысяч што галасавалі за № 5 у Дамброве, у Варшаве, у Лодзі і на „крэсах",—пабачыўшы, што, так званая, „дэмакратычная" Польшча з Пілсудзкім на чале арыштоўвае і гвалтуе прадстаўнікоў сьпіску № 5, сьпіску, у які ўх дзяць найбольш камуністы, гэтыя тысячы рабочых ужо згублены для буржуазнай Польшчы. Свойі ёняны зьвязалі з моманту выбараў раз і на заўсёды з камуністамі.

Ніштo так не магло б зрабіць папулярнымі сярод рабочых Польшчы камуністаў і ідэі адзінага фронту, як гэтыя выбары ў буржуазны Сойм.

Ніштo так не навучыць рабочых, —як арышты і зьдзекі над прыхільнікамі і пілянорамі «Саюзу Рабочых».

Трэба сказаць, што галоўны сэнс і галоўнае значэньне выбараў у гэтым, а ня ў ліку дэпутатаў.

Жыцьцё не стаіць на адным месцы. Жыцьцё бяжыць. Выбары ў Сойм—гэта першы крок к стварэньню масавай Камуністычнай Рабочай Партыі Польшчы.

За 1000 арыштованых—Камуністычная Рабочая Партыя Польшчы атрымала дзесяткі тысяч і сотні тысяч спачуваючых.

Сотні тысяч падыйшлі бліжэй к ідэям клясавай барацьбы. Бліжэй падыйшлі і пераднілісь з камуністамі.

А гэта самае галоўнае, што патрэбна рэвалюцыйнаму руху, што патрэбна масавай пралетарскай партыі.

М. Мар—скі.

IV Кангрэс Камуніст. Інтэрнацыяналу.

Зіноўеў аб рабочым урадзе.

МАСКВА, 13-11. На пасяджэньні Кангрэсу Камуністычнага Інтэрнацыяналу 12-га лістапада Зіноўеў сказаў: «Кожны буржуйны ўрад адначасова зьяўляецца капіталістычным, але ня ўсякі рабочы ўрад бывае пралетарска-сацыялістычным. Буржуазія мае свае атрады ўнутры рабочай клясы, рабочая клясa ня мае сваіх урадаў унутры буржуазіі. Рабочы ўрад павінен стаць пачатковым пунктам дыктатуры пралетарыяту. Ён можа прымаць розныя формы. Важна ня форма, а палітычны зьмест. Грунтоўны зьмест рабочага ўраду—барацьба супроць буржуазіі. Мы павінны змагацца з думкай, што рабочы ўрад нібы ёсьць мірны пераход к камунізму. Рабочы ўрад не замяняе дыктатуры пралетарыяту, не перасьцерагае ад грамадзянскай вайны. Рабочы ўрад—гэта мера для збліжэньня з масамі. Другі шлях заўладаньня масамі—адзіны фронт.

Наша партыя павінна быць самастойнай: ей належыць будучыня. Там, дзе шырокія масы неарганізаваны, значна лягчэй разгарнуць шырокі пралетарскі рух. Справа ня ў тым, каб больш пралетарыяту было ў нашай партыі важан здабытак уплыву над большасьцю пралетарыяту. Так, невялікая Камуністычная Партыя Паўдзённага Уэльсу змагла правесьці ў Прафэсыянальны Інтэрнацыянал 200,000 рабочых. Гішпанская партыя дасягнула вялікіх вынікаў з дапамогай тактыкі адзінага фронту. Гэта тактыка абяцае посьпех у Польшчы. Насоўваецца цяжкія часы ўсясьветнай рэакцыі, але прыдзе час, калі Камуністычны Інтэрнацыянал павядзе рабочую клясу ў наступ».

Прамова Зіноўева пакрываецца доўгімі і гучнымі апладысмэнтамі.

Кангрэс аднагалосна прымае рэзалюцыю, якая ўхваляе дзейнасьць Выканаўчага Камітэту.

Прамова Леніна.

На пасяджэньні Кангрэсу Камуністычнага Інтэрнацыяналу 13-га лістапада з прамовай аб новай эканамічнай палітыцы выступіў Ленін, спатканы бурнай апладыя. Справаздача аб прамове будзе заўтра.

У панскай Польшчы.

Зьдзекі ў Галіцыі

Украінска газэта «Свабода», якая выдаецца ў Львове замест зачыненай газэты «Діло», ахвяроўвае чарговы папярэдні артыкул у № 9 апошнім здараньням у Галіцыі. Артыкул пільна пагрэмзан цэнзурай і на 3/4 зьяе белымі плямамі. У артыкуле засталося незакрэсьленым вось што:

«Польскай уладай праведзена шмат арыштаў у Львове і ў гарадох і сёлах Галіцыі. Турмы перапоўнены тысячамі ахвяр мужчын і кабет, прафэсароў, настаўнікаў, адвакатаў, дактароў, інжэнэраў, сьвяшчэньнікаў, студэнтаў, рамесьнікаў, рабочых, мяшчан і селян—людзей розпага становішча і ўзросту, сярод іх школьная маладзь. Лік арыштованых дасягае некалькі тысячаў, ня лічачы тых, якія знаходзяцца ў польскіх турмах з даўных часоў.

Арыштаваным не паведамлена аб прычынах арышту, без дазнаньня іх трымаюць цэлымі тыднямі ў голадзе і холадзе. Паліцэйская і турэмная улада чыніць усялякія беззаконасьці: катаваньне, забойства.»

Пасьля вялікага плешу пішыцца далей:

«За правідловасьць зьмешчаных тут фактаў ручаемся сваімі подпісамі». Далей ідуць подпісы вядомых прадстаўнікоў украінскай інтэлігэнцыі.

Гвалт над камуністамі.

ВАРШАВА, 12—11. Арыштаваны выбраны дэпутатам сойму камуніст Рыбацкі.

Бліжня-Усходняе пытаньне.

Апошнія дні.

АНГОРА, 11-11. Султан яшчэ знаходзіцца ў дварцы. Гарынгтон раіць яму не адракацца ад прастолу. Ангельцы прывезьлі ў Стамбул 15 аэраплянаў. З дапамогай ангорскага друку ангельцы стараюцца ўцягнуць жыхарства ў непарадкі.

У Англіі неспакой.

ГАННОВЭР, 11-11. У Лёндане панае трывога ў зьвязку з становішчам на Бліжнім Усходзе. Бонар-Лёў заявіў, што становішча ня менш сур'ёзнае, чымсь у момант наступу камалістаў на Чанак. Трывога ў Лёндане павялічваецца ў зьвязку з адмаўленьнем Пуанкарэ спаткацца з Керзанам і Муссаліні да скліканьня Лёзанскай канфэрэнцыі. Газэта „Пці Парызьен" паведамляе аб магчымасьці адмаўленьня Англіі ад удзелу ў Лёзанскай канфэрэнцыі.

Патрабаваньні камалістаў.

АНАПОЛІС, 12-11. Камалісты зноў патрабавалі ад саюзьніцкаў выводу войска з Канстантынопалю, спыненьня кантролю над гаможенамі і чыгункамі.

Апошнія патугі.

ЛІФІЛЬД, 12-11. Маршал Фош падаў Пуанкарэ пляны захопу саюзьнікамі Канстантынопалю.

Муссаліні падтрымоўвае.

РАЎЭН, 11-11. Муссаліні абяцаў Францыі поўнае ваеннае падтрыманьне ў Канстантынопалі.

Зьмяінае шыпеньне.

(Варшаўскія газэты аб выбарах да Сойму).

Калі выявіліся рэзультаты выбараў да Польскага Сойму, то блізка што усе партыі і групы, выступаўшыя на выбарах, пачулі вялікае нездаваленьне. Чорнасотніцкая «Х'ена» атрымала 169 мандатаў з агульнага ліку 444,—але-ж яна лічыла на палавіну; пэпэсаўцы атрымалі ўсяго на ўсяго 40 мандатаў. Для партыі, з якой выйшаў сам пан «Начальнік Дзяржавы», малавата. Усе другія партыі строяць кіслыя міны: некаторыя з іх не правялі ані аднаго кандыдата. У ліку іх знайходзіцца так рэкламованая «Унія» (№ 10). Адны толькі «нацыянальныя меншасьці» задаволены. Праз блёк і паміма блёку яны дасталі 1/6 усіх мандатаў (усяго нянольскага насяленьня ў Польшчы 1/3). Налічнасьць у Сойме 88 нянольскіх дэпутатаў нервуе усе польскія газэты і партыі. Таксама вельмі вельмі нянрыемны для іх факт правядзеньня камуністамі 2-х дэпутатаў, не зважаючы ні на якія гвалты і арышты. Польская буржуазея і сацыял-прадаўцы думалі, што зьяўленьне камуністаў у новым Сойме немагчыма, «дзякуючы прынятым мерам». Факт, што здарылася адваротнае, прыводзіць у ашаламленасьць усе польскія партыі, як П. П. С., так і эндэкаў. «Бі жыдоў і іншых інародцаў, зьчістажай камуністаў, якія хочуць прадаць Польшчу бальшавіцкай Маскве!»—вось лёзунг, выстаўлены «Кур'ерам Поранным» і «Роботнікам». Гэта не газэтныя артыкулы, а нейкае зьмячае шыпеньне. Факт правалу № 10 прыводзіць у ашаламленасьць панаў з «Кур'ера Пораннага».

Абвінавачуўшы ва ўсіх няшчасьцях «Х'ену» (сьпісак № 8—хрысціян. нацыян. еднасьці), газэта пераходзіць да блёку нацыянальных меншасьцяў, прычым зьмяшчае яўна правакацыйныя весткі аб блёку. Буржуазная і нават рэакцыйная істота гэтага блёку ясная ўсім, хто прыглядаўся да яго працы і яго «дзеячоў». Аднака «Кур'ер Поранны» пускае брахню, што блёк працаваў... на бальшавіцкія групы! А ў дадатак да ўсяго «благога»,—піша газэтка ў нумары ад 7 лістапада,—«з крэсаў даходзяць невясёлыя весткі. Нацыянальныя меншасьці, шчодра запаможаныя расейскімі Саветамі і нямецкімі агэнтамі, грамадою рушылі да выбараў на Вялыні, з нябывалай заядласьцю проціў усяго, што зьяўляецца польскім, будучы разьюшаным брутальным нацыяналізмам «Х'емы», і здабылі да 80 процантаў усіх галасоў. Блёк нацыянальных меншасьцяў увойдзе ў Сойму ў імпануючай лічбе і пры двух роўных палавінах проціваістаўленых адна другой польскіх партый, будзе дыктаваць варункі за дазвол на спакойную дзяржаўна-творчую працу.

Пераходзячы да працы камуністаў, газэтка за найвялікшы грэх Х'ены» лічыць адсутнасьць еднасьці паміж «Х'енаю» і ўсімі іншымі польскімі партыямі, што дало магчымасьць камуністам правясьці аднаго дэпутата нават ад самай Варшавы.

Газэтка з непамернай злосьцю піша, што «выбары выявілі прысутнасьць 26000 камуністаў*) у сярэдзіне выбарнага цела сталіцы. Камуністаў выразных, рашучых, сьвядомых, якія застаюцца ў цесным зьвязку з чужым урадам, якія падкопваюцца пад палітычнае істнаваньне Польшчы.

Камуністаў несьвядомых, якіх зьяўляюцца падгатаванай глебай для будучай агітацыі,... ёсьць непараўнана болей».

Нам вельмі прыемна чуць такое прызнаньне ад нашых заядлых ворагоў; нам прыемна чытаць, што не зважаючы ні на якія ўціскі і гвалты, нашы польскія таварышчы маюць удзячны грунт да камуністычнай агітацыі.

Газэтка «пэпэсаў «Роботнік» зьмяшчае часта такія артыкулы, якія аніяк не пасуюць сацыялістычнаму органу, а былі-б якраз на мейсцы хіба толькі ў такіх газэтах расейскай мінуўшчыны, як «Русское Знамя» альбо «Земщина». Аднак, нісколькі не саромячыся, газэтка ўсё яшчэ друкуе аншлагі: «Хай жыве сацыялізм!», «Хай жыве рабоча-сялянскі ўрад!» У артыкуле, ахвяраваным вынікам выбараў, у нумары ад 9 лістападу, «Роботнік» па часьці шавінізму пакінуў далёка ззаду і эндэкаў і ўсе іншыя партыі. Усім, хто прыглядаўся да польскага выбарнага закону, вядома што гэты закон мае вельмі мала супольнага з, так званым, «дэмакратызмам» і ўвесь пабудаваны так, каб штучна паменшыць прадстаўніцтва ад няпольскай часьці насяленьня Польшчы. Цяперка, калі выявілася, што гэты закон ня даў пэпэсам нічога харошага, а быў выкарыстам «Х'енаю» ды буржуазеяй «нацыянальных меншасьцяў,—пэпэсаўскі «Роботнік» навальваецца на выбарны закон, знайходзіць яго дрэнным і заяўляе, што пры «нармальным, учцівым выбарным законе... нацыянальныя меншасьці не атрымалі-бы столькі мандатаў».

Шга належыцца да крытыкі «блёку нацыянальных меншасьцяў», то яна зроблена «Роботнікам» едавіта і праўдзіва. Блёк характэрызуецца, як хаўрус «жыдоўскіх ганцляроў, нямецкіх юнкераў, беларускіх і ўкраінскіх мужыкоў! Жыд, які аддае свой голас за антысэміта і блізка што чорнасоценца расейца, украінскі мужык, які галасуе за жыдоўскага купца з Варшавы! Набожны прававерны, «халатовы» жыд, нямецкі юнкер, беларускі і ўкраінскі эсэр, а можа нават якісь замаскаваны камуніст—у адным выбарным блёку!»

Так, гэта праўды! Кампанія нічога сабе! Але ж шавінізм пэпэсаў таксама быў прычынаю стварэньня гэтага проціва натуральнага «блёку») Пэпэсы таксама могуць «ганарыцца» тым, што іх шавінізм памог буржуазеі „нацыянальных меншасьцяў“ ачмурыць працуючыя масы свае нацыянальнасьці. Дзякуючы ім, працуючыя масы нацыянальных меншасьцяў занесьлі класавай барацьбы са сваёй буржуазеяй падтрымалі яе на выбарах. Сталася тое, што камуністы казалі даўно: разьдзьмухіваньне нацыянальных спрачнасьцяў адцягае пралетарыят ад класавай барацьбы. „Сацыялісты“ пэпэсаўцы павінны былі б гэта ведаць! Але самае цікавае тое, што пэпэсы паўстаюць проціў дэпутатаў „блёку“ не таму, што гэта буржуі альбо людзі з буржуазнай ідэалёгіяй, а таму, што гэта дэпутаты „нацыянальных меншасьцяў“. Інакш кажучы, па артыкулах „сацыялістычнага“ „Работніка“ ёсьць тоўсты налёт самага яўнага чорнасоценнага шавінізму.

Орган „Х'ены“—„Рэч Посполіта“ у ранішнім нумары за 8-е лістапада заклапочана магчымасьцю супрацоўніцтва дэпутатаў ад „нацыянальных меншасьцяў“ з левымі польскімі партыямі.

Пры нармальным ходзе справы, буржуазныя дэпутаты „дзяржаўнай“ нацыі і буржуазныя дэпутаты „нац. меншасьцяў“, павінны былі б аб'яднацца дзеля супольнай барацьбы з рэвалюцыйнымі элемэнтамі. У сучаснай жа бела-панскай Польшчы, польскі шавінізм, як крывое люстэрка, каверкае ўвесь выгляд рэчаў. Тут магчымы такія бяссэнсіцы, як аб'яднаньне „сацыялістаў“ пануючай нацыі з буржуазнымі дэпутатамі нац. меншасьцяў дзеля барацьбы з буржуазеяй пануючай нацыі. Але пры тым шавінізме, якім ахоплены ўсе партыі сучаснай бела-панскай Польшчы, магчыма і другая камбінацыя: аб'яднаньне «сацыялістаў», эндэкаў і іншых дзеля супольнай барацьбы з з інародцамі (у пэўных пытаньнях). Адным словам, магчымы «агульна-нацыянальны фронт».

Вось да чаго можа дакаціцца «сацыялістычная» партыя, калі яна не адкіне рашуча ўсіх нацыянальных забабонаў, калі яна не парве з нацыяналізмам. «П. П. С.»-жа стаць на такую дарогу ня можа. У перадавым артыкуле «Роботніка» за 10-е лістапада гало най заслугай пэпэсаўцаў лічыцца не барацьба за рабочую клясу, а барацьба за ўтварэньне польскай арміі, польскай «незалежнасьці», выслаўляецца «дзяржаўны інстынкт П. П. С.» і не заядлая барацьба з бальшавізмам і камунізмам, у якой П. П. С. выперадзіла эўрапейскі сацыялізм».

Адным словам, сучасная бела-панская Польшча з усімі яе партыямі і газэтамі зьяўляецца адной многагаловай шыпячай гадзінай, перапоўнёнай ядам нацыяналізму і шавінізму. Адною з галоў гэтай гадзіны зьяўляецца і П. П. С. Калі рабочая класа Польшчы, як казачны волат, пераможа гэтую гадзіну, то няхай не забудзецца адсячы і тую яе галаву, што мае надпіс: «П. П. С.».

А. Венцяровіч.

*) На пазьнейшых падліках каля 25000.

Розныя весткі

Землетрасеньне ў Паўдзённай Амэрыцы.

ГАННОВЭР, 13—11. У Паўдзённай Амэрыцы на пабераджы Чылі адбылося землетрасеньня, якое абхапіла абшары ў 1500 міль. Горад Коквімбо зусім разбуран. 500 дамоў развалілася. Налічваюць звыш 200 забітых. Па ўсім краю налічваюць некалькі тысячаў разбураных дамоў. Землетрасеньне абхапіла таксама Аргэнтыну. У Буэнос-Айрэсе ў часе землетрасеньня застанавіліся гадзіньнікі і згасьлі ўсе сьвечкі. Па ўсёй Паўдзённай Амэрыцы пануе сполах.

ратэст супроць акупацыі Сахаліну.

ЧЫТА, 11—11. Іоффэ зьвярнуўся к японскаму ўраду з пратэстам супроць прадаўжэньня акупацыі Сахаліну японскім войскам і з паграбаваньнем зараз жа эвакуіраваць войска з занятай мясцовасьці.

10 гадзін працы.

БЭРЛІН, 12—11. Станьнее прапанаваў увесьці 10-цёх гадзінны працоўны дзень.

У Савецкай Фэдэрацыі.

Дапамога беспрацоўным

МАСКВА, 13-11. Пастаноўлена адпусьціць Народнаму Камісарыяту Працы 320,000 пуд. харчоў для дапамогі беспрацоўным.

Х-ы Ўсерасейскі Зьезд Саветаў.

МАСКВА 13-11. 20-га сьнежня склікаецца Х-ы Ўсерасейскі Зьезд Саветаў. У парадку дня: даклады ЎЦВК, Савету Народных Камісараў, міжнароднае становішча і становішча прамысловасьці, даклады Наркамзему, Наркамасьветы і Наркамфіну, пытаньні савецкага будаўніцтва і выбары ЎЦВК.

Прамысловасьць аднаўляецца.

ХАРКАЎ, 13-11. У Харкаве пасьля двохгадовай стаянкі пушчан у ход найвялікшы на Ўкраіне піваварны завод.

ДЗЯК.

(Апавяданьне.)

Было за поўнач. Цёмна было ў мястэчку. Кропаў дробны, густы восеньні дожджык. Здавалася, што гэта вільготная цемра сыплецца з вялізарнага рэшата на местачковыя хаты, якія нібы туліліся адна да аднэй упопемках.

Па вуліцы цёпкаўся забрызганы гразьзёю дзяк. Ён аглядаўся на ўсе бакі, выстаўляў рукі перад сабою, дуючы, што во-во нешта ці некага намацае ўпопемках.

У галаве ў яго прыемна шумела, сэрца горача тузалася ў грудзёх, а ногі выкідываліся наперад, як асобныя істоты, і як-бы наўмысьне трапялі ў лужыны. У дзяка сягоньня быў надзвычайна цікавы і жывы дзянёк: быўшы валасны старшыня Мікіта Аўдзей выгнаў вядро самагонкі і запрасіў добрых людзей «пакаштаваць». Быў сэкратар цяперашняга іспалкому з жонкай, быў вастраносы настаўнік і заядлы п'яніца фэльчар.

Пачастунак-баль пачаўся ад поўдня. Хоць самагонка трохі аддавала агідным пахам, ад якога нянрыемна ікалася і гудзела ў жываце, аднак госьці пілі яе з зьсосам, хвалілі віншура і смачна закусывалі кілбасою, салам і асуркамі. Пасьля дзесятай чаркі дзяк так павесялеў, што бяз жаднай музыкі закасаў полы і пусьціўся ў скокі. Цмокаў губамі, тарарамкаў і вырабляў нагамі драпачок.

Кампанія ўся плёскала ў далоні, рагатала і нянрыкмеціла, не пачула спачатку, што з вуліцы, з пад вакна льецца ў хату нейкая музыка. Пачуўшы музыку, госьці ажна ахнулі з дзіва і засталіся з разьзяўленымі ртамі, на падобіе літары «О».

Музыка як-бы з неба звалілася, надзвычайна пекная, ды яшчэ ў гэткую патрэбную хвіліну, калі душа радуецца, скача і сьпявае, калі пад воблачкамі самагонкі здаецца, што самі сьцены, стол і закусі радуюцца, скачуць і сьпяваюць.

Усе прыціхлі і пачалі прыслухоўвацца з урачыстасьцю на тварах. Пад п'янымі мазгамі ўсе былі пэўны, што гэта ня звычайная чалавечая музыка, а нейкія чары—нябёсная музыка. Верылася і ня верылася. Божны шчыпаў сабе за нос, думаючы мо' гэта толькі сон. Пры гэтым дзяк на памылцы шчыпнуў за бок чырвонашчокую дачку старшыні і рвануў моцна, ажна яна падскочыла на табурэце і крыкнула: «Фэ, брыдка!»

Музыка раптам сьціхла, як-бы з прычыны дзякаўскага праступку. Чары скончыліся неспад яванa, на што дзяк зазлаўся і забасаваў на ўсю хату:

— Міхаіл архангэл! Труба ярыхонская! Валі ў хату!

Нядоўга чакаючы, паказаўся ў дзьвярох таёмны чараўнік-музыка. Гэта быў бедны вандроўна-катарынщык. Выставіўшы катарынку перад сабою, як скрыню з дарагім скарбам, ён зьняў шапку і стаў пасярод хаты.

Усе вельмі ўзрадаваліся нечаканаму, патрэбнаму цяпер гасьцю, пасадзілі яго за стол, і дзяк сам узяўся за катарынку і давай круціць ручку. Катарынка таталюкала хрыплым голасам «На сопках Манчжуры» і «Маруся атравілася», а старшыня з фэльчарам скакалі, як казлы, пад гэтае мінорнае таталюканьне. Як яны ўмудрыліся скакаць пад такую музыку, дык ужо дзяк ня ведае.

Што далей было, дзяк ня памятае. Надта бурна прайшоў дзянёк у гасьцёх. Ён, дзяк, лез да ўсіх цалавацца, прычым так надакучаў, што фэльчар плюнуў яму ў скалмачаную барадзу.

Яшчэ цяпер, успамінаючы аб гэтым, дзяк злаваўся і бурчэў:

— Духоўніка ў бараду плявацы! Д'ябал! Сатана! Гэрэтык! Хара!

Пры слове «хара» дзяк намацаў дзьверы сваёй хаты і крыкнуў:

— Адчыні, маці!

Доўга трымаўся ён за клямку, бо заспаная жонка марудзіла, запаліла маленькую лямпачку і выйшла ў сенцы з лямпачкай у руках.

— Наглымзаўся зноў, паскуда!—выляяла яго жонка, адчыніла дзьверы, паставіла лямпачку на стол і пайшла ў цёмную каморку спаць.

Дзяк ціханька зьняў паліто, сеў за стол і глыбока задумаўся. Адна думка засела каменем у яго мазгох ужо даўно, некалькі год, і неміласэрдна клявала яму, патылічку: ён задумаў пісаць летапісь. Усё не выбіраўся, а цяпер настаў час пісаць. Поўнач, ціцыня, лямпачка на стале, за сьцяной храпе жонка... Вось калі настала шчасьлівая гадзінка пісаць. Ніхто перашкаджаць ня будзе.

Дзяк зморшчыў лоб, напусьціў на сябе сур'ёзнасьць, выняў са століку атрамантніцу з ручкай і давай шукаць паперу, якая была даўно прыгатоўлена. Парыўся дзяк па ўсіх кутках пакою і не знайшоў паперы.

— Тым лепей!—сказаў ён. Зьняў з паліцы запыленае, старое эвангельле і давай яе ліставаць. Шырокія, белыя поля на старонках эвангельля як-бы самі прасіліся:

— Пішы на нас. Мы ад самага патопу, ад сатварэньня сьвету чакаем цябе!

Дзяк аж падскочыў з радасьці.

— Найначай, сам дух сьвяты накіраваў мяне на гэтую сьвятую кнігу. На ёй і буду пісаць.

Дзяк разлажыў эвангельле, умакнуў ручку ў атрамант ды ўжо хацеў пісаць, але раптам усхваціўся.

— Няможна сталёвым пяром паганіць сьвятое эвангельле. Калісьці летапісцы пісалі гусінымі пярамі. Чуць нечысьць мяне не заблутала. Але дзе ты цяпер дастанеш гусінае пяро?

Зноў бяда. Дзяк засмуціўся. Але раптам стукнуў сабе пальцам у лоб і павесялеў.

— Калі нама гусінага, дык будзе добра курынае пяро! Дзяк гэта ня толькі думаў у сабе ўнутры, але прабасіў словамі на ўсю хату, на царкоўны лад:

— Калі нама гусінага, дык будзе добра курынае пяро!

Ня доўга чакаючы, дзяк узяў качаргу, якая стаяла ля печы, узяў лямпу са стала і вышаў у сенцы. Праз колькі хвілін куры паднялі такое голаснае кудахтаньне, нібы хто іх душыў. Доўга вазіўся ў сенцах з курамі дзяк. Нарэшце ён увайшоў у хату, трымаючы ў руцэ некалькі пер'яў.

Дзяк завастрыў сцілорыкам пяро і сеў за стол.

Ядраныя друкаваныя літары на старонках эвангельля рухаліся, як

Лясная асьвета на Беларусі.

Лясны Тэхнікум.

Беларускі Дзяржаўны Інстытут Сельскай Гаспадаркі яднае ў сваіх руках усю лясную асьвету на Беларусі. Апрача лясных катэдраў, якія істнуюць пры Інстытуце, Управа Інстытуту адчыняе ў Жорнаўскім лясьніцтве, перададзеным Інстытуту дзеля навукова-дасьледчых мэтаў, трохгадовую лясную школу—Лясны Тэхнікум.

Прыёмныя экзамены для паступаючых пачнуцца 27-га лістапада, а заняцьці 5-га сьнежня.

Кіраўніцтва Лясным Тэхнікумам узложана на лясьнічага Жорнаўскага Вучэбнага Лясьніцтва, вучонага лесавода Ч. А. Бялюнаса, які раней лічыўся лектарам Палітэхнічнага Інстытуту і губэрскім інспэктарам лясоў. Настаўнікамі ў Тэхнікум запрошаны спэцыялісты па розных галінах лясной асьветы.

У вучэбны плян Лясного Тэхнікуму ўваходзяць усе галоўнейшыя спэцыяльныя лясныя навукі, як, напрыклад: лесаводзтва (агульнае і частковае), таксацыя, лесабудаўніцтва, лесакарыстаньне (лясная тэхналёгія), лясная эканомія і статыстыка. Як падгатоўчыя навукі будуць выкладацца: грунтазнаўства з асновамі мінэралёгіі, фізыка з асновамі мэтэорологіі, хімія і інш.

Пачатковым ядром Тэхнікуму, адзінага на Беларусі, выявілася рээвакуіраваная з Ніжгародзкай губэрні былая Варшаўская Лясная Школа; прывезены струманты і вучэбныя падсобнікі.

Сёлета будуць істнаваць дзьве клясы: першая — Лясного Тэхнікуму, другая — рээвакуіраванай Лясной Школы, якая вясной дасьць свой выпуск у чалавек 15. Гэтакім чынам, праз год Беларусь будзе мець ужо каля 15 лясных спэцыялістаў, у якіх адчуваюць вялікую патрэбу нашы лясьніцтвы.

У будучыне курс Лясного Тэхнікуму разьлічан на тры гады. Значыцца, у 1925 годзе адбудзецца першы выпуск лясных тэхнікаў, вывучаных тут, на Беларусі, а дзеля гэтага добра знаёмых з абставінамі тутэйшай лясной гаспадаркі.

Агульны нагляд і кіраўніцтва навуковай часткай Тэхнікуму будзе належыць Інстытуту Сельскай Гаспадаркі, у асобе прадстаўнікоў лясных катэдраў, і такое цеснае супрацоўніцтва, можна спадзявацца, дасьць карысныя вынікі. Інстытут Сельскай Гаспадаркі будзе таксама дзяліцца з Лясным Тэхнікумам часткай сваіх вучэбных падсобнікаў і нават прыладамі.

Працуючы супольна з Лясной Дасьледчай Станцыяй, якая зараз арганізуецца таксама ў Жорнаўскім лясьніцтве, Лясны Тэхнікум, разумеецца, будзе прымаць удзел у дасьледах на абшарах лясьніцтва, а дзеля гэтага можна спадзявацца, што новыя лясныя тэхнікі будуць навукова падгатоўленымі лясными спэцыялістамі.

Лясная Дасьледчая Станцыя.

Думка аб Лясной Дасьледчай Станцыі даўно займала лесаводаў Беларусі. Нярэдка на лясных зьездах падымалася пытаньне аб арганізацыі лясной навукова-дасьледчай лябараторыі дзеля вырашэньня праз дасьледы насьпеўшых пытаньняў лясной гаспадаркі.

І толькі з адчыненьнем Інстытуту Сельскай Гаспадаркі ў Менску ўдалося, урэшце, ажыцьцявіць думку лесаводаў Беларусі.

У Жорнаўскім лясьніцтве, якое знаходзіцца пад ведамам Інстытуту Сельскай Гаспадаркі і дзе калісьці нямецкімі лесаводамі вялася культурная лясная гаспадарка, заразарганізуецца Лясная Дасьледчая Станцыя. Дзеля пастаноўкі навуковых дасьледаў, з агульных абшараў Жорнаўскага лясьніцтва вылучана дванаццаць кварталаў, каля 25 дзесяцін кожны.

Жорнаўская лясная дача, адведзеная дзеля арганізацыі Лясной Дасьледчай Станцыі, выключна цікавая як для лесавода-прыродазнаўцы, гэтак і для лесавода-эканаміста. У ёй расьце ў дзікім выглядзе дзесяць сартоў дрэваў (сасна, ёлка, дуб, ясень, ліпа, альха, граб, клён, асіна і бяроза), вывучэньне якіх павінна будзе зьяўляцца галоўнейшай працай Лясной Дасьледчай Станцыі.

Агульнае кіраўніцтва працай Лясной Дасьледчай Станцыі ўскладаецца на лясныя катэдры Інстытуту Сельскай Гаспадаркі. У працы станцыі будуць прымаць непасрэдны ўдзел як студэнты Інстытуту, гэтак прафэсарскі і лектарскі пэрсанал.

Пад будынак Лясной Дасьледчай Станцыі, супольна з Лясным Тэхнікумам, быў намечан дом былога галоўнага лясьнічага князя Радзівіла, але гэтымі днямі дом гэты быў падпалены якімісьці злачынцамі, і Станцыя засталася ў вельмі кепскім становішчы. Праца яе павінна будзе спыніцца, за выключэньнем тых дасьледаў, якія будуць адбывацца ў лесе. Лябараторную і гаспадарчую працу прыдзецца весьці ў Менску, карыстаючыся навукова-падсобнымі ўстановамі Інстытуту Сельскай Гаспадаркі.

Ня гледзячы на розныя перашкоды, Лясная Дасьледчая Станцыя ўсьпешна пашырыць сваю навуковую дзейнасьць і заложыць моцны грунт для лясной асьветы на Беларусі.

В. П.

Беларуская мова як сродак агітацыі.

(З практыкі перадвыбарнай агітацыі да Польскага Сойму).

Дзеля таго, каб найлепш падыйсьці да беларускага селяніна, трэба зьвяртацца да яго ў яго роднай, найлепш зразумелай яму беларускай мове. У Польшчы, альбо лепш кажучы, у Заходняй Беларусі, часова забранай цяпер бела-палякамі, гэтую ісьціну вельмі добра разумеюць усе, пачынаючы ад патрыётаў беларускае мовы, беларускіх нацыяналістаў, і канчаючы самымі заядлымі ворагамі беларускай нацыянальнасьці наогул і беларускіх працуючых масаў у асобку. Калі падыйшлі выбары да Польскага Сойму, пачалася фармальная пагоня за галасамі беларускага сялянства, тых беларускіх «хлопкаў», якіх у звычайны час паны і за людзей ня лічуць. Як ні круціся, а трэба падлажвацца пад настрой і гумор гэтага «хлопка», калі хочаш, каб ён памог пралезьці на цёплае мейсцачка соймавага дэпутата.

І мы бачым, што пэльны шэраг чыста польскіх буржуазных партыяў, ворагаў беларускага працуючага народу, калі надыйшлі выбары, загаварылі пабеларуску, абяцаючы цёмнаму «хлопку» амаль не залатыя горы і разьлічаючы потым ашукаць гэтага даверчывага «хлопка» ды яшчэ пасьмяяцца з яго даверчывасьці.

Перш за ўсё—выданьні «вызваленцаў», якія шырэй за ўсе іншыя польскія партыі разьвярнулі перад выбарную агітацыю на беларускай вёсцы. Яны нават выдаюць спэцыяльную газэту пабеларуску: «Вызваленьне народу". Апрача таго імі выдана некалькі адозваў. У былым Сойме дэпутаты «Вызваленьня» галасавалі за вайсковую калёнізацыю «крэсаў»,—за тое, каб памешчыцкую і бежанскую зямлю ў Заходняй Беларусі аддаць не беларускаму сялянству, які сорадвеку паліваў гэтую зямлю сваім потам, а польскім салдатам. Каб лепш здабыць прыхільнасьць беларускіх сялян, «вызваленцы» ў беларускіх адозвах зьмясьцілі пункт *проціў* калёнізацыі, якога няма ў іхніх польскіх адозвах. Адным словам, не пагрэбавалі яўным жульніцтвам.

Далей (у парадку нумэроў дэпутацкіх сьпісаў) ідуць «рады людовыя,»—тыя самыя «рады», што ў часе вайсковай акупацыі былі ўтвораны дзеля барацьбы з беларушчынай. Вось і яны выпусьцілі адозву з эсэраўскім лёзунгам «*Зямля і воля* працоўнаму народу», сулячы гэтаму працоўнаму народу тое, чаго ніхто з іх ня думаў і ня думае ніколі даваць.

Пабеларуску-ж выступіў і «Польскі Цэнтр»—№ 12 Гэтыя паны зямлі на суляць, але абяцаюць даходніць «аблягчэньня пазычкі зямельнай», каб закабаціць на дзесяткі гадоў сялянскія масы, заставіць іх аддаваць зьнак са свае працы ў панскія кішэні.

Далей ідуць польскія паны-абшарнікі з Заходняй Беларусі, якія па прыкладу ранейшых «ісьціння-рускіх» выкінулі са сваіх адозваў нават самае імя нашай Бацькаўшчыны. Гэта—«Дзяржаўнае зьяднаньне на крэсах» (№ 22). І не зважаючы на гэта, усё-ж такі пішуць адозвы пабеларуску.

Так званыя беларускія «актывісты і „зялёнадубцы“, разам з пагромшчыкам Бялаховічам, хоць і называюць сябе беларусамі, але фактычна ліюць ваду на панска-польскае вола.

Урэшце, трэба ўспомнуць аб агітацыйных выданьнях у беларускай мове «Саюзу Пралетарыяту Места і Вёскі». Паліцэйскі ўціск і арышты дзеячоў Саюзу перашкодзілі яму разьвярнуць сваю працу, як належыць. Але ўсё-ж такі ў Горадні знайшлася кучка шчырых працаўнікоў, адданых справе працуючых масаў. Гэтая кучка працаўнікоў выдала адозву пабеларуску і газэту «Вясковы Пралетары» (за нас чакаў толькі адзін нумар). У адозьве Саюзу справа пастаўлена ясна і выразна. Посьле зьнішчаючай крытыкі польскіх буржуазных і сацыял-згодніцкіх партыяў выстаўлена праграма Саюзу ў чатырох пунктах. Саюз заяўляе, што ён «будзе дабівацца ў Сойме:

1) канфіскацыі ўсяе памешчыцкае зямлі і перадачы яе тым, хто сам на ёй працуе.

2) Перадачы зямлі бяднейшаму сялянству зусім бясплатна.

3) Неадкладнай выдачы малазямельнаму і безьзямельнаму сялянству доўга-тэрмінова грашовае пазычкі дзеля палепшаньня сельскае гаспадаркі.

4) Зьмены падатковай сыстэмы так, каб яна клалася ўсім сваім цяжарам выключна на багатыя клясы грамадзянства».

Газэта Саюзу вельмі выгадна адзначаецца ад агітацыйных выданьняў іншых партый чысгатою беларускае мовы. Відаць, што над газэтаю поацавалі людзі, добра ведаючыя беларускую мову і шчырыя прыхільнікі працуючых беларускіх масаў. Газэта сваім выглядам робіць прыемнае ўражаньне і тут у Менску падабалася ўсім, бачыўшым яе, нават не камуністам.

Выданьні Саюзу карыстаюцца вялікаю прыхільнасьцю сярод беларускага сялянства, але яўна, адкрыта іх баяцца браць. Не зважаючы на пекныя словы выбарнага закону аб свабодзе перадвыбарнай агітацыі, сяляне з балючай практыкі ведаюць, што бывае з западозранымі ў бальшавізьме.

У кожным разе грунт камуністычнае агітацыі сярод заходняе-беларускага сялянства вельмі добры. Толькі трэба ўмела ўзяцца за працу!

М. С.

жывыя істоты, міргалі яму так відавочна, ажно ў вачох мітусілася.

— Пішы, пішы!—шапталі яму літары,—пастаў у суседстве з намі на белых палёх усе грахі, усе дзеяньні, якія дзеюцца вакол, на памяць будучым пакаленьням...

І дзяк пачаў вывадзіць курыным пяром на белых палёх эвангельля буйныя літары, на кшталт друкаваных. Ён пісаў:

«У імя айца і сына і духа сьвятога пачынаю. Царства Антыхрыстава ўзбаламуціла увесь сьвет. Людзкія галовы закруціліся, як малатарні; топяцца ў блуду, нібы сыр у сьмятане, і кажуць, што няма бога ні на небе, ні на зямлі».

Пры слове «блуду» дзяк усьміхнуўся. Чырвонашчокая дачка старшыні, як жывая, туманіла яму вочы. Дзяку здавалася, што ў цёмным кутку хаты нехта хіхікнуў. «Гэга, пеўна, чорт»—падумаў ён і тры разы перажагнаўся.

Дзяк перавярнуў лісток і давай маляваць чорта, з барадой, з рагамі і з хвастом. Чорт да сьмяхоты вышаў падобным да бацюшкі. Тут дзяк успомніў, што яму ўжо некалькі тыдняў здаецца, што ў бацюшкі на ілбе зьяюць агнёвыя рогі пячысьціва.

Побач з чортам эвангельскі тэкст гаварыў аб тым, як сын божы выганяў злых духаў з людзей. І дзяк зьніяў прыпісаў:

«Божа! выгані беса з нашага бацюшкі, раба твайго. Ён у апошнюю надзелю гаварыў ка аньне з амбону і з такім імпэтам размахіваў рукамі ажна расшпілілася доўгая халаміда, і ўвесь народ пабачыў, што бацюшка забыўся апрануць нагавіцы»

Пры гэтым дзяк так моцна зарагатаў, ажна жонка прачнулася. Яна выскачыла спалоханая з чорнай каморкі, выцірала вочы, касурылася на мужа, думаючы, што ён раптам звар'яцеў.

— Ідзі ўжо дрыхаць! Лотра ты, п'яніца!—ад усяго сэрца лемантавала жонка.

Дзяк ёй нічога не адказаў ды яшчэ галасьней рагатаў. Жонка плюнула тры разы і зноў пашла спаць.

Дзяк успакоіўся, перавярнуў лісток і давай вывадзіць літары. Пісаў, круціў галавой і хітра ўсьміхаўся ў бараду. Ён пачаў пісаць побач з тым мейсцам, дзе сейбіт у эвангельскай прытчы выходзіў у поле насеньне расьсяваць. Доўга перавяртваў ён лісток за лісткам ды ўсё пісаў.

Дзяк у душы быў пэўны, што цар жыве, што ў хуткім часе вернецца назад. Дзеля гэтага ён пісаў пару данос на ўсіх недаверкаў і «супастатаў».

«Усе з вёскі Закутніцы перасталі спавядацца ўжо другі год. На цэркаў божую нічога не даюць. Яны запісаліся ў камуну і засялі маёнтак у маёнтку пана Дзярыскуры. Учыні над імі, божанька, тое, што ўчыніў над Садомам і Гаморай.

«У вёсцы Зяблікаў перасталі ў школе вучыць закон божы. Школьнікі называюць мяне «барадатым дзякам» і перасталі мяне паважаць. Выйшлі на іх, Ільля прарок, лютага мядзьведзя з лесу—няхай ён перадушыць усіх дзяцей».

Дзяк намалявў грамаду дзяцей, на якіх напаў мядзьведзь.

«Брата свойго малодшага я выправіў у лес ваяваць з бальшавікамі. Я яму строга загадаў выразаць усіх нехрысьцяў і паліць бязбожныя вёскі. Пры гэтым я загадаў яму штодня маліцца. Дай яму, божа сьвяты, сілачку і здароўе. Аман».

Дзяк набожна глянуў на сьвятыя абразы на сьцяне над сталом і перажагнаўся.

Дзяк доўга сядзеў над эвангельлем і старанна выводзіў літары. Усе палі кнігі, усе белые куточкі ня ён запоўніў сваёй пісаніной. Усё пісаў богу даносы і праклёны на людзей. Строгімі вочыма сьвятыя пазіралі са сьцяны на «летапісца». То еты кот залез к дзяку на калені і соладка драмаў. Рабіна ляпала галінамі ва ўспапёўшыя цёмныя шыбы, як начны дух, і трохі жудасна дзяку зрабілася. Ён падазрона час-ад-часу касурыўся на вакно, і на яго нападаў страх. Але прыгульнае сапаньне жонкі ў другім пакоі ўспакойвала яго: ён не адзін у хаце, дзякаваць богу. Дзеля большай сьмеласьці ён на цыпачках падышоў да спальні і адчыніў дзьверы так, каб жончын ложак быў відаць. Перажагнаў вакно і зноў сеў за стол пісаць. Доўга пісаў, аж сьпіна забалела.

У цішыне чуў ён, як пад раніцу пелі пеўні і перакліканіся па ўсіх хатах мястэчка. На яго напала шаласьць—ён хацеў на ўсю хату крыкнуць «ку-ка-рэ-ку», на што быў вялікі майстар, але стрымаўся—пры такой сьвятой пісаніне не выпадае балавацца.

Раптам дзяк ні з таго, ні з сяго ўскочыў і стаў на ногі. Ён прыпомніў, што, выходзячы ад старшыні, яму гаспадар усунуў у кішэню пляшку самагонкі на дарогу. Ён дастаў з кішэні пальта бутэльку і давай ліць сабе ў глотку сівуху. «Буль-буль буль!—глуха пералівалася гарэлка. У дзяка настрой быў вельмі падняты. Ён кінуўся на калені перад абразамі і пачаў маліцца аб тым, каб зараз-жа зьявіўся цар-бацюшка да яго ў хату.

Ён маліўся шчыра, біў моцныя паклоны і быў пэўны, што бог споўніць яго жаданьне.

— Узьявіся, замазаньнік божы, цар зямлі нашай, узьявіся сюды!—буйным шэптам гаварыў дзяк і біў сабе кулакамі моцна ў грудзі. Лоб яго ўспацеў. Мокрыя валасы калмаціліся. Вочы напрытомна гарэлі на бледным твары.

— Зараз-жа прыдзі ў кароне залатой, пад званы царкоўныя, пад трубы медныя, цар з дома Раманавых!

Дзяк дрыжэў усім целам, качаўся па зямлі і час-ад-часу адварачваўся да дзьвярэй глядзець, ці ня йдзе ўжо цар.

Сьвятыя з старасьвецкіх тоўстых рамаў строга пазіралі на дзяка; ад міганьня лямпачкі здавалася, што яны мігаюць вачыма, як жывыя.

Дзяку здавалася, што цуд ужо пачынаецца, што зараз-зараз прыдзе яго пажаданы госьць.

— Сьляды твае, цар вялікі, цалаваць буду, як калісьці блудніца цалавала ногі Хрыста. Барадой сваёй буду выпіраць пыл з ног тваіх. Прыдзі, прыдзі!

Горача зрабілася дзяку. Агонь гарэў у яго грудзёх. Сэрца моцна стукалася, а ў вачох пачалі мільгаць зялёныя кругі. Дзяк шаптаў усё цішэй і цішэй. Галава зрабілася цяжкой і вочы пачалі зьліпацца.

Зноў дзяк, лежучы на падлозе, як-бы раптам анямеў - акамянеў. Лямпа згасла і пачало сьвітаць.

Дзяк ляжаў на падлозе і моцна спаў. На стале валялася расчыненае сьпісанае эвангельле, а побач сядзеў задуўшыся кот і тасмна мурлыкаў...

З. Відуля.

Рассаднік п'янства.

(Патрыярхальнае жыцьцё пагранічнай паласы на Беларусі.)

У агнівіх вуварох мясцовых часопісаў шмат пісалася аб п'янстве ў іншых вёсках, аб хабарніцтве розных Селсаветаў, Іспалкомаў і г. д.

Калі гэтыя бытавыя абразкі маюць месца ва ўсіх паветах Рэспублікі, дык самы росквіт іх разумеецца на пагранічнай паласе паміж Беларуссю і Польшчай. Там у працягу апошніх двух год вытварыўся свой спэцыфічны быт, здоблены шляхецкай патрыярхальнасьцю фальварачнай «інтэлігэнцыі».

Граніца, як гэта бывае ўсюды і заўсёды, паважыла свой адбітак на блізкія ваколіцы, якія займаюцца «заходняй культурай», ня гледзячы ні на якія строгія пасты.

Гэтая «культура» пераплывае к нам у выглядзе кантрабанды. Тыя жыхары, якія жывуць на самай граніцы, ведаючы ўсе сьцежачкі сваёй ваколіцы, умудраюцца чуць ня штодня бываць заграніцай, г. з. у суседняй вёсцы пад Польшчай. Такія вёскі часам здараюцца на 1/4 вярсты ад лініі.

Прыносяць і прывозяць адтуль розныя тавары і гарэлку. Паміж іншым там надта лёгка па лясох фабрыкаваць і самагонку.

Такім чынам адтуль і разыходзіцца гарэлка, як чужая фабрычная, таксама і свая, па ўсёй Беларусі.

У большасьці пагранічнае жыхарства вельмі разбагацела эд сваіх прамыслаў, адчуваецца там, так званая, грашовая „удаль", якая мае вылікі ўплыў на Сельсаветы, Іспалкомы і г. д.

Культурна-асьветных гурткоў там бадай няма, школы таксама сустракаюцца мала. Газэту рэдка дае пасачыш.

І вось пры такіх абставінах людзі забаўляюцца толькі вечарынкамі, на якіх часам бываюць і польскія легіянэры. Год таму назад гэта было ў некаторых мясцох звычайным зьявішчам.

Легіянэры фальварачнікі кормяць сялян адной нявіной—аб зьменах пагранічнай мяжы. Такім чынам шмат вёсак знаходзіцца пад пастаянным упльывам фальшывых чутак і плёткаў. Яны думаюць, што во-во яны зробяцца польскімі грамадзянамі і стараюцца быць, як гэта кажуць, „і вашым і вашым".

Жывучы пастаянна ў такой „ідыліі", ня дзіва, што сярод тамтэйшага «прамысловага» люду, які займаецца кантрабандай і вытварылися свае пагляды на рэчы і на ўсё акружаючае.

І вось мы лічым, што самая крыніца п'янства і ёсьць пагранічная паласа, дзе пануе разрашчоная, гвілая псыхіка. Адтуль розныя дарогамі і пупявінкамі п'янства пашыраецца і па іншых мясцовасьцях —аж да самага Менску, дзе ёсьць шмат такіх патаемных рэстаранчыкаў з самагонкай і розныя пітвамі з заграніцы, дастаўленыя сюды кантрабандыстамі.

Калі мы хочам, каб п'янства ў нас зьменшылася, дык трэба працаваць энэргічна ў двух напрамках: 1) узмацаваць пагранічную савецкую стражу і 2) пашыраць у пагранічнай паласе культурна-асьветныя гурткі і школы.

За кантрабанду трэба караць не грашовымі штрафамі і кароткатэрміновымі арыштамі, а высылкай у аддалёныя месцы Расеі. Трэба, каб спэцыяльная камісія разьбіралася па пагранічных мясцох і рабіла апросы ў беднага мужыцтва аб тых асобах, якія займаюцца кантрабандай. Усе такія асобы, ня гледзячы на тое, ці знайшлі ў іх кантрабандных тавараў, ці не,—павінны быць высланы. Пры гэтым можа быць ужыта і канфіскацыя маемасьцяў.

Пры крутых іэнэргічных мерах гэтае зло можа быць зьнішчана ў працягу яіх колечы трох месяцаў. Такія меры павінны прымацца і проціў самагоншчыкаў.

Культурна-асьветная работа ў гэтых мясцох пасее сярод працоўнага сялянства свядомасьць. Тады закончацца вечарынкі пад чадам самагонкі, і гарэлка з тых палясыноў на будзе развозіцца па ўсяму краю.

На гэту справу трэба налегчы і моцна налегчы, тады можам быць пэўны, што ў „зялёнага зімея" будуць адсечаны ўсе галовы.

А чым скарэй—тым лепей.

К. Ц.

Цэнтральны Дом Селяніна у Маскве.

12 лістапада ў Маскве адчыніўся Цэнтральны Дом Селяніна. На ўрачыстасьці прысутнічалі: Калінін, Чычэрын, Сасноўскі, Яканенка і шмат гасьцей, а таксама сялян хадакоў з розных канцоў Рэспублікі, якія спаткалі прыхільны прыём у Доме Селяніна. Пасяджэньне адчыняе Сасноўскі, які заначае, што Цэнтральны Дом Селяніна—сымбаль цеснага саюзу рабочых і сялян. Калінін, спатканы гучнымі апладысмэнтамі, заявіў, што Цэнтральны Дом павінен быць прыкладам для адчыняемых у розных мясцох Рэспублікі Дамоў Селяніна. Дом Селяніна павінен знаёміць селяніна з гарадзкой культурай і зьядноць працоўных гораду і вёскі.

Чычэрын у яркай прамове даказа, што нашы ворагі больш усяго разьлічваюць на разьяднаньне рабочых і сялян. Яны памыляліся. Адзінасьць працоўных—апора Савецкай улады. Капіталісты зараз бачаць, што Савецкая ўлада перамагла сваіх ворагаў толькі дзякуючы саюзу рабочых і сялян. Адчыненьне Дому Селяніна паказа заходняму селяніну, якую значнасьць мае саюз рабочых і сялян.

Саколнікаў зазначае, што Савецкі ўрад сапраўдна, што без адраджэньня сельскай гаспадаркі ня можа адрадзіцца прамысловасьць, ня можа ўмацавацца ўвесь край. Вось чаму, ня гледзячы на нахват сродкаў, Савецкі ўрад адпускае штомесячна на агранамічную дапамогу мілён рублёў золатам. Дом Селяніна мае важную ролю ў справе адраджэньня сельскай гаспадаркі.

Пасяджэньне зачыняецца прамовай Яканенкі. Словы Яканенкі: «Нахай жыве саюз рабочых і сялян на працоўным фронце» пакрываюцца гучнымі воплескамі і гукамі Інтэрнацыяналу.

Па Менску.

Агульна-асьветныя курсы на паветах.

Наркампрос пазволіў адчыняць агульна-асьветныя курсы на паветах. Пры гэтым на адчыненьне гэтых курсаў у кожным асобным выпадку дазваленьне будзе выдавацца толькі па пастанове калегіі Наркампроса. Плата за навучаньне варыяцьна будзе ўстанаўлівацца калегіяй Наркампросу.

Агульна-грамадзянскі падатак.

Галоўміліцыяй зроблен загад усім аддзяленьням міліцыі Беларусі, ў якім ім прапануецца пры зьвяртаньні да іх прыватных грамадзян па сваім угрэсных справах патрабаваць ад іх квітанцыі аб уплаце агульна-грамадзянскага падатку. Пры адсутнасьці гэтых квітанцый ніякіх дапамог ім не рабіць.

У Беларускім Сельска-Гаспадарчым Інстытуце.

9 лістапада пачаліся вучэбныя заняцьці ў адчыненым Дзяржаўным Інстытуце Сельскай Гаспадаркі.

Першая лекцыя па вышэйшай матэматыцы была прачытана прафэсарам Арнфэльдам пры перапоўненай студэнтамі аўдыторыі ў прысутнасьці ўсяго складу прафэсароў і настаўнікаў Інстытуту з рэктарам на чале.

На лекцыі прысутнічаў Камісар Земляробства Беларусі тав. Славінскі.

М. В.

Адпраўка ўцекачоў.

З Менску адправіўся ў Польшчу 97-й эшалон з уцекачамі. У бліжэйшыя дні будзе адпраўлен 98-ы.

Да ведамма сяброў Беларускага Рабочага Клюбу.

У чацьвер, 16 лістапада, адбудзецца агульны сход сяброў Бел. Раб. Клюбу. На павестцы—пытаньні вельмі-вельмі важныя і пільныя, а дзеля гэтага ўсе сябры павінны зьявіцца на сход у памяшканьне Клюбу па Юраўскай вуліцы № 19 роўна а 7 гадзін ўвечары. І калі не зьбярэцца належны лік сяброў к 7 гадзіне, дык а 9 гадзіне назначецца другі сход, які будзе паўнамоцным вырашаць пытаньні пры ўсякім ліку прысутных.

Праўленьне Клюбу.

Бюльлетэнь № 106

Менскай Мэтэаролёгічнай Станцыі Галоўнай Фізычнай Обсэрваторыі пры Менскай Дасьледчай Балотнай Станцыі.

За 13 і 14 лістапада 1922 годзі.

СТРУМЭНТ.	1 гадзіна дню.	9 гадз. вечара.	7 гадз раніцы
Баромэтр	755,9m/m	755,4m/m	754,4m/m
Тэрмомэтр	1,2°	2,0°	1,4°
Максымальны тэрмомэтр	1,2°	2,0°	2,5°
Мінімальны тэрмомэтр	—0,5°	1,0°	1,2°
Вільгаць паравуваўчая	100%	96%	89%
Асадкі ў міліметрах	—	—	—
Грунтавы тэрмомэтр на глыбіні 0,8 м.	3,1°	3,0°	3,0°

Днём густы туман.

Згублены:

— Лічн. карт., выд. Бачанкім Вал. Ваен. Адд., Ермалаева В. Е., кв. 5479.

— Пасьведч., выд. Менск. Управ. конай зялезн. дарог. № 532, Сідаровіча М. А., кв. 5480.

— Мэтрычн. выпіс., выд. Барысаўскай Абшчэст. рабін. № 2437, Лаўдус Г. М. М., кв. 5481.

— Мэтрычн. выпіс., выд. Менск. казён. рабінам № 288, Кальнельсон, С. М. кв 5482.

— Пашп., выд. Шт. Менск. Гар. Міліц. у 1917 г. № 1001, Тургеля М. Э, кв. 5483.

— Пашп., выд. Покшыцкай Мяшч Управ. № 137, Шарлот Р. М., кв, 5484.

— Пасьведч. па наружн. віду, выд. Каміс. пры Менск. Пав. Ваен. Кам. эд 27/X—21 г., Пінцрыка Х. Г., кв. 5485.

— Пасьведч. асобы, выд Дзярж. Паліт. Управ. Бел. № 821, Лукянчыка, кв. 5486.

— Пашп., выд. Койданаўскай Мяшч. Управ., Гершанавай Г.-Л. П. кв. 5487.

— Пашп., выд. Менск. Мяшч Управ., Гершанавай Х. С. кв. 5488.

— Лічн. карт., выд. Сібірск. Пав. Ваен. Кам. № 355, Гарадзенскага С. Я., кв. 5489.

— Часов. від на жыхар., выд. Менск. Гар. Міліц., Мазель С. Я., кв. 5490.

— Мэтр. выпіс., выд. Менск. Заксам, Маргольнаў Эн. Хаі Лазарэвіча і Гіты, кв. 5491.

— Лічн. карт., выд. Менск. Пав. Ваен. Кам., Кагенёвіча Г. І., кв. 5492.

— Часов. сямейны від на жыхар., выд. Менск. Гар. Міліц. № 7437 Бартэнэвічу П. А. і А. С., кв. 5493

— Членск. кн., выд. саюз. Цвэтпрому № 542, Алішук О. Т., кв. 5494.

— Часов. від на жыхар., выд. Хойкаўскай Гар. Міліц. 2 раёну, Чарной П. А., кв. 5495.

— Часов. від на жыхар., выд. Полтаўскай Гар. Міліц., Альпяровіча Э. З. кв. 5496.

— Часов. від на жыхар., выд. Полтаўскай Гар. Міліц., Капелёвіча Г. А., кв. 5497.

— Пашп. кн., выд. Пецярбурск. саветам № 28/35954, Рабінсона В. А., кв. 5498.

— 1) Часов. адпускн. пасьведч.; 2) пасьведч. асобы выд. Маскоўскім аддзелам апалу Краснапрасьненскага раёну, Ключаўскага А. С., кв. 5499.

— Пашп. сямейны, выд. Менск. Мяшч. Управ. № 2768, Леановічаў В. Л., кв. 5500.

— Часов. пасьведч. выд. Менск. Ваен. портэмонтрам № 413, Кукес Х. Д., кв. 5501.

— Мэтрычн. выпіс., выд. Менск. Заксам, Шапіра Р. Н., кв. 5502.

— Часовы від на жыхар., выд. Менск. Гар. Міліц, Перасолава П. В., кв. 5503.

— Пашпарт, выд. Менск. Гарадзк. Міліц., Растоўскай С. Ш., кв. 5504.

— Пашпарт сямейны, выд. Менск. Мяшч. Упр за № 1609, Біргэраў П. А. і Э. М. кв. 5505.

— Два пасьведч. асобы, выд. Менск. Сл. руху заходн. чыг. за №№ 25243 і 25153, Перасолавых П. В і П. Д., кв. 5506

— 1) Членск. кн., выд. Менск. Учкпрафсож. заходн. чыг.; 2) правіз. карт., выд. Менск. Сл. руху заходн чыг. за № 42582, Перасолава П. В., кв. 5507-5508.

— Конска учотн. карт., выд. Самахвалавіцкім Вал. Ваен. Адд., Мыхвіча К. М., кв. 5509.

— Часов. від на жыхар., выд. Менск. Гар Міліц. № 8100, Гальперын Г. А., кв. 5510.

— Конска - учотн. пасьвед., выд. Сёмкава-Гарадзецкім Вал. Ваен. Адд., Дзятко А. І., кв. 5511.

— Пашп. бестэрм., выд Менск. Паліц. Управ., Альтшуля І. М., кв. 5512.

— Пасьведч. аб скавч. Койданоўск. школы 2 ступ. № 1033, Бедэрсона А. М., кв 5513.

— Дзьве конска-учотн. карт., выд. Сёмкава-Гарадзецкім Вал. Ваен. Адд., Шляхвенка Н. Г., кв. 5514.

— Лічн. карт., выд. Самахвалавіцкім Вал. Ваен. Адд., Глінскага І. С., кв. 5515.

— Звальніц. біл., выд. Каміс. пры 109 зводна - эвакуац. шпіталі № 340[10698, Новака І. В. кв. 5516.

— Пасьведч. асобы, выд. Наркамземам Бел. № 2; 2) членскі біл., выд. саюз. Працаўн. зямлі і лесу № 643, Юркевіча А. А., кв. 5448.

— Лічн. карт., выд. Менск. Пав. Ваен. Кам. № 423, Мірскага М. Г, кв. 5517.

— Конска-учот. карт., выд. Сеньніцкім Вал. Ваен. Адд., Купрэйчыка В. Т., кв. 5518.

— Часов. від на жыхар., выд. Менск. Гар. Міліц. № 7370, Барана Г. І., кв. 5519.

— Пашп. сямейны, выд. Вішкеўскай Вал. Управ., Гасьпяровічаў М. Ф. і І. Ф., кв. 5520.

— Лічн. карт., выд. Валікасельскім Вал. Ваен. Адд. № 21, Шабала П. І. кв. 5521.

— Часов. від. на жыхар., выд. Менск. Гар. Міліц., Дукорскага В. Г. кв. 5522.

— Пашп., выд., Омскай Гар. Міліц., Худзіка С. І., кв. 5523

— Пашп. бестэрм., выд. Менск. Мяшч. Упр. за № 6634, Акуліча П. В., кв. 5524.

— Пашп. бестэрм., выд. Менск. Мяшч. Упр. за № 1636, Акуліча Э. Л., кв. 5525.

— Часовы від на жыхар., выд. Менск. Гар. Міліц., Любвер С. В., кв. 5526

— Мэтрычн. выпіс., выд. Менскім Заксам, Любвер Д. М., кв. 5527.

— Лічн. карт., выд. Варашылаўскім Вал. Ваен. Адд. за № 18, Адамовіча М. М., кв. 5528.

— Конска-учотн. карт., выд. Сёмкава-Гарадзецкім Вал. Ваен. Адд. за № 34, Вашкевіча В. Ф. кв 5528.

— Конска учотн. пасьведч., выд. Сёмкава-Гарадзецк. Вал. Ваен. Адд. за № 34. Вашкевіча В. Ф., кв. 5529.

— 1) Лічн. карт., выд. Аксунаеўскім Вал. Ваен. Адд.; 2) пасьведч. асобы, выд. Аксунаеўскім Вал. Быт. Кам., Логінава А. Н., кв. 5530-5531.

— Пашп. сямейны, выд. Уяўлянскай Мяшч. Упр., Голубаў М. Л. і З. А., кв. 5532.

— Лічн. карт., выд. Радашковіцкім Вал. Ваен. Адд. за № 35, Высоцкага М. Ф., кв. 5533.

— Лічн. карт., выд. Радашковіцкім Вал. Ваен. Адд. за № 577, Кулаковіча Е. А., кв. 5534.

— Патэнт і квіт. аплачанага пратаколу, выд. Нар. Каміс. Грашовых Сраў Бел., Кумок Р. Д., кв. 5535.

— Шчот на 20 п 16 ф. скуры, выд. канторай «політайп», Эпцінна Мордуха кв. 5536.

— Конска учотн. пасьведч., выд. Каміс. пры Менск. Пав. Ваен. Кам., Кучынскага Н. А., кв. 5537.

Ахотвіцкі біл., выд. Беларуцкім Саюз. Ахотнікаў, Палішчука А. І., кв. 5538.

— Пашпарт, выд. Пецярбурскай Паліц. Упр., Фрэнкеля І. Д., кв. 5539.

— Лічн. карт., выд. Заслаўскім Вал. Ваен Адд. № 3, Крыванова М. І., кв. 5540.

— Пашп. бестэрм., выд. Штаб. Менск. Гар. Міліц. у 1917 г., Шавельзона М. І., кв. 5541

— Лічн. карт., выд. Сёмкав Гарадзецкім Вал. Ваен. Адд. № 34, Манькевіча С. М. кв. 5542.

— Учотн. пасьведч. на каня, выд. Сёмкавы-Гарадзецк. Вал. Ваен. Адд., Маньк вічв С. М., кв. 5543.

— Два пасьведч. асобы з фатаграфічн. карточк., выд. Менск. Сл. руху Заходн. чыгун., Вечар І. Ф. і А. М., кв. 5544.

— 1) Учотн. адрэзак „В", выд. Мабіліз. адд. Заходн. чыгун.; 2) пашп., выд. Вызьнянскай Вал. с. Управ., Вечар І. Ф., кв. 5545-5546.

— Пашп., выд. Менск. Паліц. Управ у 1915 г., Вечар А. М., кв. 5547

— Мэтрычн. выпіс., выд. царкоўнай мяст. Смаргонь, Вечар Н. І., кв. 5548.

— Пашп. сямейны выд. Менск. Мяшч. Управ., Казлоўскіх Г. В. і Л. І., кв. 5549.

— Учотн. пасьведч. на каня, выд. Заслаўскім Вал. Ваен. Адд., Канацкага Іосіфа, кв. 5550.

— Пашп., выд. Сеньніцкім Вал. Вып. Кам. № 631, Сержан С. Б., кв 5551.

— Пашп., выд. Менск. Паліц. Управ., № 5210, Эйнштэйн М. Л., кв. 5552.

— Пашп., выд. Менск. Акцыз. Управ. № 180, Бух Е. В., кв. 5553.

— 1) Лічн. карт., выд. Сёмкава-Гарадзецк. Вал. Ваен. Адд. № 28; 2) квіт аб заплаце за будоўлю, выд. Менск. Пав. Зямельн. Адд., Нарыкевіча І. С., кв. 5554 5555.

— Часов. від на жыхар., выд. Менск Гар. Міліц., Іванскай Н. Н., кв. 5556.

Пашп., выд. Навагрудзкай Пав. Паліц. Управ. № 37, Ланда Х.—М. С., кв. 5557.

— Польскі від на жыхар., выд. Польск. Паліц. 5 вуч. м. Менску, Розенглюм Б. В., кв. 5558.

— Пашп., выд. Менск. Мяшч. Управ., Левінсон С. М, кв. 5559.

— 1) Лічн. карт., выд. Раманаўскім Вал. Ваен. Адд. Нова-Міхалаеўскай губ.; 2) часов від на жыхар., выд. Нова Міхалаеўскай Гар. Міліц., Бабінскага Я. А., кв. 5560-5561.

— Шлюбны выпіс, выд. Раманаўскім вал. с. Заксам, Бабінскіх Я. А. і М. Д., кв. 5562.

— 1) Часов. від. на жыхар, выд. Омскай чыгунач. Міліц.; 2) пасьведч. па скарач. штат., выд. Омскай Сл. руху, Ліхіменка Г. О, кв. 5563.

— Часов. від на жыхар., выд. Менск. Гар. Міліц. № 3424, Шапіра Д. Р., кв. 5564.

— Мэтрычн. выпіс. выд. Смаргонскім рабінам, Фрыдзон З. Ш., кв. 5565.

— Часов. від на жыхар., выд. Менск. Гар. Міліц., Крывіцкага Л. А. кв. 5566.

— 1) Пасьведч. асобы; 2) прыязны біл., выд. Менск. Сл. руху Акцыз чыгун.; 3) учотн. адрэзак „В", выд. Мабіліз. Адд. Акцыз. чыг., Келекан А. С., кв. 5567.

— Дыплём зубн. урачэ, выд. Харкаўскім Унівэрсыт. у 1918 г., Вальфсон Г. Я., кв. 5568.

— Пасьведч. асобы, выд. Столпецкай Мяшч. Управ., Шымановіч М. Л., кв. 5569.

— Пасьведч. асобы, выд. Столпецкай Мяшч. Управ № 701, Шымановіч Г. Л., кв. 5570.

— Пашп., выд. Крайскай Вал. Управ., Занкевіч А. В., кв. 5571.

— Часов. від на жыхар, выд. Менск. Гар. Міліц, Вайнштэйн С. С. кв. 5572.

— Мэтрычн. выпіс, выд. Менск. Заксам, Евраціновіч-Мацчадзкай Х.-В. Э., кв. 5573.